**Цэна асобнаго нумэру 5 кап**

Год други. Вильня 11 лютаго (февраля) 1907 г. № 6.

# Наша Нива

## Першая Беларуская Газэта з Рысунками

**Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрамп.**

Цэна з перэсылкою и дастаукою да хаты: на 1 г.— 3 р., на 6 мес. — 1 р. 50 кап., на 3 м. — 75 к., на 1 мес. — 25 к. Без дастауки и перэсылки: на 1 г. — 2 р. 40 к., на 6 м.— 1 р. 20 к., на 3 мес. — 60 к., на 1 мес.—20 к. За границаю: на 1 г.— 4 р., на 6 мес. — 2 р., на 3 мес. — 1 р. Перэмена адрэсу — 20 кап.

Падписка прынимаецца и прадаюцца атдзельные нумэры газэты: 1) У Канц. „Нашай Нивы“ — Завальная вулица дом № 45, кв. 20. 2) У Книгарни „Знание“ — Георгиеуски проспэкт дом № 14. 3) У Книгарни Литоуской М. Пясэцкой — Шпапэлис, Доминиканская вулица дом № 13.

Адрэс рэдакции и администрации: **Вильня, Завальная вулица, дом № 45.**

Абъяулення прынимаюцца на наследней страницы па 20 кап. за линейку малыми литэрами. Рукаписы и корэспондэнции, присланные у рэдакцию, мусяць быць чытатэльна написаны з праудзивою фамилею и адрэсом таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падписаць прозвищэ разом з фамилею, хто незахочэ, каб была надрукована праудзивая фамилия. Адрэс и фамилия тольки для ведама рэдакции.

*Вильня 11 лютаго (февраля).*

Яя видна з тэлеграм аб выбарах, у Расеи праходзяць у Думу болей людзи, што стаяць за народную свабоду и социалисты, у нашай Беларусии, на Волыни, западнай Украйне и Польшчы прайшли найболи людзи, што не стаяць за свабоду и лепшую долю працуючаго народу: павыбирали у Думу памешчыкаў, чорнасоценникоў, духоўных. Тольки у Коўне, гдзе мужыки павыбирали ад валасцей и вуездоў выбаршчыкоў абразованых и сведомых тольки там патрафили пакиравацца у губэрни мудра и цьвёрда и паслали усих дэпутатоў, што будуць цьвёрда стаяць за ўсю волю и за ўсю землю. У беларуских губэрнях памешчыки, бискупы и архирэи—лёгка пазбивали з толку нашых вёсковых людзей. А на вуездных выбарах было з каго выбирацъ, але на гэтых выбарах мужыки кепска выбирали, усё больш гаспадароў, а не таких што панимаюць палитыку. Тым часам у гэтым гаду ўсе вораги мужыкоў добра нарыхтавалися (сарганизавалися). Будзе нам навука на други раз!

# Выбары.

— о —

### Выбары у Вильни.

Каб аписаць, як прайшли у нас выбары ў Думу ад Виленскай губ., прыпомним, што памешчыцких выбаршчыкоў палагаецца на нашу губэрнию 44, мужыцких 40, гарадзких 7 и адзин рабочы. Ня будзем гаварыць аб тым, якая тут справедливосць, што мильён мужыкоў мусиць менш пасылаць выбаршчыкоў, як кучка памешчыкоў. Скажэм пра самые выбары. Ў числе памешчыцких выбаршчыкоў были бискуп Рооп и ксёндз Родзевич, што падбиваў Ошмянских выбаршчыкоў каб выбирали паноў и ксяндзоў. Ад мужыкоў двое не прыехали саўсим: Кобзик Свенцянскаго вуезду и Козакевич Троцкаго, так што у мужыкоў сила паменшылась на два голасы, и усяго мужыцких выбаршчыкоў асталося 38. З гарадоў было 6 жыдоў и адзин хрысцянин. Выбаршчык-рабочы сядзеў ў турме, але на выбары яго мусили выпусциць. Памешчыцких, а затым мужыцких выбаршчыкоў было найбольш. И адным и другим хацелася, каб правесци ў Думу сваих. Каб не было семи гарацких выбаршчыкоў, дык памешчыки мала с ким и гаварыли-бы. Маючы галасоў больш, як мужыки, яны правяли бы ўсеньких сваих. Але тут напаў на их страх, каб мужыки не злучылися з гарадзкими, бо тагды мужыки пераважылиб их и не прапусьцили бы ни воднаго памешчыка. Вотож дзеля гэтага перад выбарами адзин багаты памешчык Корвин-Милеўски прасиў жыдоўскаго выбаршчыка Бака кинуць мужыкоў и прылучыцца да памешчыкоў, каторые абецали за гэтае выбраць ў Думу двох жыдоў. Тагды памешчыки правели бы, акром двох жыдоў, яшчэ трох сваих, а мужыком асталося бы выбраць аднаго дэпутата, катораго яны и так мусяць выбраць па закону, апроч других. Але жыды адказалися ад такого гандлю. Яны згаварылися злучыцца з мужыками и падаваць за их кандыдатоў голасы н..вэт и ў таким разе, кали мужыки не захочуць правесьци

ни воднаго их жыдоўскаго кандыдата, бо яны добра ведали, што и невучоны мужык лепей пастаиць у Думе за праўду, як абразованы, сыты памешчык. Найбольш будзе дабивацца праўды, хто пакутуець ад неправды. А пакутуюць ад неправды найбольш мужыки и жыды. И мужыки-выбаршчыки зразумели, што иначэй не здалеюць сваих вечных ворагоў, як тольки злучыўшыся з жыдами. Яны не захацели быци несправедливыми и сагласились даць жыдоўскаму дэпутату адно месцо. Ўсё шло добра: 38 мужыкоў, ды сем гарацких, ды адзин рабочы—ўсяго 46 голасоў, значыць, больш як у памешчыкаў. Памешчыки перапалохалися. Але тут найшлися памеж мужыкоў—прадацели. Няведама, ци за грошы яны прадалися памешчыкам, ци за абецанку дэпутацкаго месца, ци за салодкую гарбату, тольки чатыры выбаршчыки з Лидзкаго павету: Вацлаў Кононович, Антон Штурма, Пётра Цихно и Казимир Цилиндзь перайшли на сторану памешчыкоў. Гэтых выбаршчыкоў адправиў ў Вильню ведамы ўсим Василишски ксёндз Соколоўски и схаваў их у паноў. Ледзьве знайшли их мужыки и ледзьве перавалакли их з помачаю аднаго добраго ксендза к сабе.

Але хоць и перайшли яны на кватэру да мужыкоў, суменне свае заставили таки у памешчыкоў. Таким парадком у памешчыкоў стала 48 голасоў, а у мужыкоў з гарадзкими и рабочым ўсяго 44. Гэтые 4 мужыки ўвесь час бунтавали усих и разстроили саглас; яны падбунтавали гвалтам перайсци на казённую кватэру, и марпалак выгнаў аттуль ўсих пастаронных, што мужыкам памагали зрабиць саглас памеж сябе, а таго добраго ксендза, што памагаў мужыком, выцягнуў силай за руку. Пакуль были у заездзи, было слабодна и добра, не было у мужыкоў нияких гувэрнантак з барадою!

У дзень выбароў з самаго ранку пайшли ўсе ў касцёл, гдзе бискуп барон Ропп ў казанню сваем казаў, каб выбираць набожных каталикоў разам з памешчыками, а хто ня будзе так рабиць, той будзе гарэць у пякельным агню. Але не успамянуў тольки бискуп, гдзе будуць тые, што прадаюць справу сваих братоў, и тые, што на гэта их падбили?! — Адлучылася тады ад мужыкоў ешчэ кольки чалавек — адурманили им галавы!

За тым ў доме, гдзе были выбары, памешчыки заперлися ў буфэце са ўсими зменшчыками-мужыками. Другие мужыки хацели прайсци ў буфэт, каб паглядзець, што там робицца, але их не пусцили, навэт аднаго выбаршчыка лякай з усей силы пихнуў за тое, што ён упираўся мацней за других. Стали мужыки выбираць аднаго свайго. Голасы разбилися, и тольки за другим разам выбрали Пелейку з Ошмянскаго павету. Як абъявили, што выбраны Пелейко, памешчыки

---

# БУНТ.

I.

Нешта трэвожнае и патаённае рабилася ў вёсцы. Мужыки зьбиралися ў кучки, спорыли меж сабою и талкавали. Як тольки паявляўся старшына ў гэту кучку, яны змоўкали, або пачынали гаварыць аб чым-нибудзь другим.

Вечэрами мужыки зьбиралися ў крайнюю хатку дзеда Юрки. Гэта быў самы стары чалавек ў вёсцы, яе жывая книжка. Дзед никому не баяўся сказаць у вочы праўду; на ўсих, навэт на земскаго начальника, казаў ён „ты“. Раз на судзе у валасным праўленни земски сказаў на дзеда, як дзед рэзнуў яму адну праўду:

— Гэта цябе не касаецца, стары бацук!

Гневам заблишчали старые вочы дзеда:

— А што, брат: не так балиць, як смярдзиць?

И, памаўчаўшы, дабавиў з гневам, глянуўшы на вусы земскаго:

— Ой, падла, хрушч, жабины начовачки! Плюнуў дзед и вышаў з канцылярыи.

Сабраўшыся ў хаци вось гэтаго Юрки и закурыўшы люльки, мужыки садзилися кале стола, над каторым смутна блишчала лямпа. Дзед сядзеў на лаўцы кале печы. Ў пячурцы ляжаў яго капшук з тутуном и крэсиво. Вакруг дзеда круцилися ўнуки. Некольки минут ў хаце царыла цишына. Тольки дым ад люлек звисаў пад столью, хрыпеў часам чый-нибудзь цыбук ды стукаў хто люлькаю аб кипець, выбиваў з яе попел.

Гутарка шла аб зямли, аб цяперашним уциску народу.

Сцёпка Леўшун ў гэтых справах быў самы дока ва ўсим сяле. Гарою стаяў ён проци крыўды обчэства и на сходах быў першы працуўник начальства. Не любили яго ни писар, ни старшына. Навэт сам земски навадзиў часта спраўки у старшыны пра Сцёпку Леўшуна. Адным словам, гэта быў чалавек „падазрыцельны“. И поп не раз казаў:

— Да, Леўшун врэдны чалавек. Ды и народ з яго ласки стаў не таки, як быў раней: недобрае ён нешта замышляе; пазирае

забили ў далони и закрычали: „Наш прайшоў!“ И пачали падаваць яму руки с сваим панским павиншаваннем. Кажуць, што Пелейко мужык ня кепски, але слабы и баязливы и таму можэць у Думе прылучыцца да пасмешчыкоў. Акром выбранаго мужыками, трэба было яшчэ выбраць пяць дэпутатоў ад вогулу выбаршчыкоў, и гэтых магли выбраць тые, у каго была большая сила, больш галасоў. А ведама, што, як прылучылися некаторые мужыцкие выбаршчыки да памешчыкоў, дык памешчыцкая партыя стала найбольшаю. Памешчыки выставили сваими кандыдатами памешчыкоў: Хоминскаго, Хэлхоўскаго, графа Путкамэра и прылучыўшыхся да их зменшчыкоў мужыкоў: Кононовича и Штурму. Дзеля запасу памешчыки выставили ксендза Родзевича и памешчыка Ваньковича. Кандыдатами мужыцких и гарадзких выбаршчыкоў были: Олехно, Косяк, Шатэнштэйн, Балкоўски и Рулькоўски. Перад праўдзивыми выбарами стали намечаць кандыдатоў записками. Памешчыки, згаварыўшыся раней с прадацелями-мужыками, нагатавали записок и зразу падали, а ўсим мужыком не дали часу ня тольки падумаць, але и записаць, и некаторые выбаршчыки так и аддали свае картачки не запоўнеными. Ў гэтых записках ўсе памешчыки падали свае голасы за Кононовича и Штурму, а зменники-мужыки-за памешчыцких кандыдатоў. Ўгледзели тут мужыцкие и гарадзкие выбаршчыки, што не здалець им саюзу памешчыкоў и прадацелёў-мужыкоў, и адказалися кидаць им галки, як пайшли настаяшчые выбары. Правяли памешчыки ўсих сваих кандыдатоў, а памеж их Кононовича и Штурму. Што робилося на душы Кононовича и Штурмы, як ўгледзели яны, што ни водная мужыцкая рука, ня личучы зменшчыкоў, не паднялася, каб кинуць на их галку, ведама аднаму Богу ды им. Але мусиць задрыжала их душа, як падняли яны вочы на тых, каго прадали. Ня вытрывали таки, пабаялися за сваю шкуру—и адказалися ад дэпутацтва. И як яны магли не адказацца? Тольки абъявили, што Кононович и Штурма прайшли, як ўсе мужыки закрычали: „Зменшчыки!.. Прадацели!.. Мильён мужыкоў прадали!!!“ И доўга не перэставали крычаць. Ад мужыцких и гарадзких выбаршчыкоў нихто не захацеў болей ставиць свае кандыдатуры, и памешчыки с прадацелями-мужыками правяли сваих запасных кандыдатоў: памешчыка Ваньковича и ксендза Родзевича.

Вось як прайшли у нас выбары. Адзин сорам нам, як ўспомним, што ў других губэрнях мужыки моцна трымаюцца адзин за другога и праводзяць ў Думу разумных, вучоных и сьмелых людзей. Нигдзе яшчэ не было, каб мужыки злучылися с памешчыками и правяли памешчыцких кандыдатоў. И ўсёж таки ня будзем саромацца мы сваих выбароў: и нашы мужыки-выбаршчыки не

---

воўком и гаварыць з табою ня хочэ. Трэба назираць за им.

— А вот у мяне ёсць свежы листок,—казаў той самы Сцёпка сабраўшымся мужыкам и даставаў з за пазухи проклямацию.

Мужыки цесным кружком садзилися кале Сцепана. Лямпу зьнимали на стол и ставили яе ў гаршчок. Листок чытали доўга. Многа было ў им непанятнага для мужыкоў. Были там такие словы, каторых яны николи ня чули.

— А праўда!—казали мужыки, як листок дачытываўся ўвесь: ў нашай, напрыклад, воласци шэсць обчэств, а каб памерыць нашу зямлю, то у нас яе будзе пэўне меней, як у дварэ!

— Меней!—смеяўся Сцепан: у нас ўсяго 3 тысячы маргоў, а у пана — 27 тысячоў! Гэта я добра ведаю.

— От ты и шукай праўды.

— Шукай—нойдзеш!...

Далей мужыки гаварыли аб тым, як цяпер трудна им стала жыць; што дваровые паля, як падкова, акружыли их благие палетки и што нема як и кроку ступиць, каб не папасци ў панские лапы.

— Эхэ!—круциў стары Юрка сиваю галавою,—а я, небоги, ешчэ сам, як быў маладым хлопцэм, пасвиў быдла пад Дубами. А ў затоках, што цяпер арэндуе старшына и царковны стараста, ўсё сяло лавила рыбу. А рыбы, рыбы было!...

И дзед не раз гаварыў пра зямлю пад Дубами, пра заплавы на рэчцы, каторые кались-то належэли да мужыкоў.

Мужыки слухали, и злосцью и зайздрасцью гарэли их вочы.

II.

— На начлег сюды мы езьдзили, — гаварыў стары Юрка, ходзячы раз у сьвята з мужыками па полю, — каней тут пасьвили. Пад гэтыми старыми дубами агонь калисьто клали. И дзед прыглядаўся на зямлю, як бы шукаў даўнейшаго огнишча, каб падцьвярдзило яно яго праўду. Але не было ниякого знаку: пяцьдзесят панских нив вырасли ўжо на гэтым поли.

— Смех и песьни хлопцоў и дзеўчат будзили некали ночны спакой гэтых палёў. Ўвесь кавалак аж да Сярэдних Дарог засе-

хацели с памешчыками и гаварыць и рабили дзеля мужыка што найлепей. Але лихо прыходзиць аттуль, аткуль яго не чакаеш. Найшлися памеж мужыкоў зменшчыки и прадали яны памешчыкам мильён працуючаго, забитаго, абодранаго, абкрадзенаго, галоднаго народу.

---

## Выбары у Ковне.

Ужо ў нядзелю ўсе мужыцкие выбаршчыки сабралися ў Ковне у адным заезьдзи и выхадзили аттуль тольки начэваць на казённую кватэру, бо ў заезьдзи было цесна. Прышли да их памешчыки и хацели згаварыцца, каб злучыцца разам паном и мужыком, алеж мужыки атказали, што яны выбяруць с памеж сябе выбарны комитэт, и комитэт гэты будзе гаварыць с панами ад имяни ўсих мужыкоў. Як выбрали комитэт, то ён пастанавиў злучыцца не с памешчыками, а з гарадзкими выбаршчыками и даць адно месцэ дэпутата жыду. Ў панедзелак прышли на сабранне мужыкоў ксендзы с памешчыками и гаварыли, каб выбирали добраго каталика, гаспадара, литвина.—„Чамуж вы“,—пыталися ксендзы,—„заместа жыда не выбярэце лепш ксендза?“ — На гэта адзин мужык атказаў, што ўсё, што ксёндз сказаў цяпер, не падобна да таго, што кажуць ксендзы з амбоны, пишуць у сваих книжкох и листах пастэрских; ксендзоў ня трэба ў Думе, нехай моляцца ў касцёли! А жыда пускаюць мужыки ў Думу дзеля таго, што шостая часць народу ў Ковенской губэрни— гэта жыды; жыдам кепска жыць и мужыкам кепска, дык жыды будуць заўсягды падтрымываць ў Думе трэбовання мужыкоў.

Пасля ксёндз сказаў, што для выбаршчыкоў бискуп будзе атпраўляць набожэнства, нехай прыходзяць у Катэдру. Мужыки на гэта атказали, што пакуль не скончаць свайго дзела, ня могуць исци; памалицца Богу з бискупам пойдуць пасля выбароў. Тады и ксёндз не пашоў.

Памешчыки гаварыли, што яны признаюць агульнае выбарнае права, растучы (прогрэсиўны) зямельны падатак; навэт признали, што мужыком трэба даць зямли, алеж за грошы.

Тады выбаршчык Казик, беларус з Браслаўскай воласци, надта добра атказаў, што праграмма ковенских памешчыкоў лепшая, больш л и б э р а л ь н а я, як памешчыкоў з других нашых губэрний, а ўсёж таки мужыки на яе не сагласны, бо аткуль мужыку ўзяць грошы, каб купиць зямли? Калиб у мужыкоў были грошы, то яны ўжо цяцер купили бы зямли, кольки трэба, без помачы Думы. Так што мужыком злучацца с памешчыками не выпадае.

Беларус Белюн, з Опсоўскай воласци Новоалександроўскаго павету, пачаў казаць

---

вали нашы мужыки...—даканчваў дзед сваю мову.

Мужыки хадзили з хмурными тварами и мерыли шырокими кроками поле, каторае належэло цяпер да двара. Яны астанаўлялися, радзилися. шукали способ вярнуць назад сваю зямлицу.

— А вы вот ешчэ пахадзилиб па поли, — сьмеяўся з их дзед: можэ што и выхадзили бы.

— А што ж ты кажэш рабиць?—пыталися мужыки.

— Мне ня трэба зямли. Я, брат,—у вырай скора; доси таптали мае ноги сырую зямлю. Вунь гдзе мая земля!—и стары Юрка паказаў рукою на могилки з трухлявыми крыжами, што сиратами стаяли ў поли, як и самы могилки, абкопаные невысоким пешчаным валом.

Раз, ужо ў позную восень, грамада мужыкоў прывалила ў школу. Сцепана выбрали дэпутатом и атправили яго да вучыцеля.

— Пане вучыцель,—пачаў Сцепан, прышоўшы на кватэру вучыцеля: мы маем да вас просьбу. Николи вы нам кепскаго не рабили и кажэце нам адну тольки праўду. Напишыце вы нам пэтыцию (прашэнне) да пана. Самы мы малограмотные, а прасиць, апроч вас, нима каго. Поп запужае нас пеклом, писар—казаками; гэта—вораги нашы. И Сцёпка расказаў, ў чым их просьба.

— Вот паглядзеце на плян, кали непраўду мы гаворым.

И Сцёпка дастаў с пад кажуха бляшаную качалку, ў каторай быў плян и ўсякие дакумэнты.

— Праўда: па пляну — земля ваша, — сказаў вучыцель,—тольки, браце, ня ведаю, ци паможэ вам гэта пэтыция. Гэта выйдзе ни больш и ни менш, як стрэлянне варэным гарохам ў цэгляную сьцену. А вы з панам ничога не гаварыли аб гэтым?

— Як не гаварыли? гаварыли. Першы раз нам сказали, што пана нема ў хаци; други раз пан сказаў, каб прышли другим разам; а трэйци раз як прышли, пан накрычаў, нашумеў—не баяўся: казакоў было повен двор—и, паказаўшы сваю панскую спину, ён схаваўся ў пакоях. Вот и ўся наша гутарка з панам.

— Ну, то добра. Я напишу вам; прыходзьце вечэром—падпишэцеся.

— Дзякуем вам, пане вучыцель!

У вечэр, як рой пчолаў, гудзели мужы-

аб тым, як граф Плятэр не дапушчае ни да возера, навэт белизну памыць, ни да лесу; тож ехаў раз праз лес бедны жыд и пачаў збираць ягады: графски лясник садраў з яго астатние лахманы.

Неяки ксёндз, чы памешчык хацеў абелиць графа и на гэта атказаў, што граф многа дабра зрабиў людзям: ён, напрыклад, збудаваў касцёл для народу. Алеж Белюн расказаў, што касцёл той збудаваны для самаго графа: ксёндз мшы николи не пачынае, пакуль не прыедзе граф. А адзин раз на Вяликдзень граф нешта спазьниўся на рэзурэкцию, и сонцэ было ўжо высоко, кали прыехаў граф. Дык людзи сьмеялися, што пакуль граф не прыехаў—сам Хрыстус нямеў права з гробу ўстаць.

Многа ешчэ гаварыли и мужыки-литвины аб сваим цяжким жыццю. Пасля ўсе сабраўшыеся мужыки назначыли 5 кандыдатоў у Думу с памеж сябе, а шостаго—жыда, и пастанавили так: „хто паставиць кандыдатам сябе—той здрайца; ўсе павинны падаваць свае голасы, як адзин, за тых кандыдатоў, каторых назначыли з агульнаго саглясу.“—Кожны написаў гэтых кандыдатоў на картачцы, каб падаць на выбарах.

На выбарах было выбаршчыкоў памешчыкоў—35, мужыкоў—39 и гарадзких—16. Прайшли ўсе мужыцкие кандыдаты. Вось яны:

1) Францишэк Гудович, 30 гадоў з вёски Стэфаново; учыўся ў Нямечыне на доктара мэдыцыны, а як скончыў, то прыехаў да хаты и сам сваими руками працуе на зямли; цягне да социалистоў.

2) Антон Купстас, 26 гадоў, скончыў 3 клясы гимазии; социал-дэмократ.

3) Адвакат Владыслав Сташынски, 32 гадоў, скончыў универсытэт; стаиць за свабоду и проциў правицельства—надта „левы“.

4) Павел Кумелис, 27 гадоў, з вёски Рукли; здаў экзамин на аптэкара; социал-дэмократ.

5) Антон Повилюс, вучыўся ў хаци; сядзеў месяц у турме ў Шявлях; социал-дэмократ.

Ўсе пяць — мужыцкие сыны. Ў Литве там мужыки аддаюць сваих дзецей вучыцца болей як у нас.

6) Адвакат Шахно Абрамсон, ад жыдоў; належыць да партии „народнай свабоды“.

Гэтыми выбарами Ковенские мужыки, литвины и беларусы, паказали, што трэба законы писаць у Думе — юрыстам (што вучылися аб законах), а ксендзам—малицца ў касцёлах!

**„Литвин“.**

---

ки ў школи. Яны црышли ўсим сялом паслухаць, што написаў вучыцель, и падписаць пэтыцию. Вось, коратка, гэта пэтыция:

„Вам (пану) павинна быць ведама, што робицца цяпер у Расеи. Льецца кроў, гарэць панские палацы... Людзям нима куды дзевацца, нима чаго есци, и яны пашли адбираць ад паноў тое, што паны адабрали ад их. Мы ня хочэм грабиць и палиць, каб чужою кроўю и слезами купиць сабе шчасце; ня хочэм браць чужога, а трэбуем ад вас таго, што вы ўсякими канцылярскими круками адабрали ад нас: 1) вярнуць назад зямлю ў урочышчы Дубы, каторая, як значыцца па пляни, належыць да нас; 2) вярнуць права карыстаць з рэчки: лавиць рыбу, зьбираць чарот и т. д.

Чакаем скораго и пэўнаго адвету...“

— Добра написана!—хвалили мужыки.

И мазолистые руки з вяликим трудом писали фамилии сваих владзельцоў. Крывые подписы мужыкоў заняли ўвесь лист паперу.

— Як пазволиць пан лавиць рыбу, дык тагды паничу будзе рыбы, кольки панич захочэ!—казали мужыки вучыцелю.

III.

Прачытаўшы пэтыцию, пан не дрэмаў. На тройцы каней панёсся ён у вуездны горад П. проста да маршалка. Ўсё начальства паднялося на ноги. Пакликали палицмэйстра, спраўника, земскаго начальника, прystава, казацкаго афицэра. На гэтым ваенным савеци - радзе нашли, што мужыки бунтуюцца. Казацки афицэр навёў спраўки, кольки ў вёсцы мужыкоў. Расшчытаўшы, што адзин казак „ў пяць минут можэ забиць двадцаць пяць мужыкоў“, ён сказаў, што для „усмирэння“ мужыкоў досыць будзе двадцаци казакоў. Спраўник паслаў ў вёски выведаць, хто писаў пэтыцию.

Ничога аб гэтым ня ведали мужыки и ўсё чакали ад пана адвету. А як пан адвету не пасылаў, то мужыки, уважаючы, што закон яны споўнили, сабралися изноў и написали прыгавор лавиць рыбу ў тых затоках, каторые па пляну належэли да их. Ўзвалиўшы на сани невад, чалавек дванаццаць мужыкоў пад камандаю Леўшуна па-

## Выбары у Минску.

У Минскай губэрни ўжо даўно перад выбарами пачали сваю пекельную работу чорнасоценцы.- Ужывали яны ўселяких способоў, каб дабицца свайго и паслаць у Думу чорнасоценных дэпутатоў. Яны цкавали людзей на людзей, праваслаўных на каталикоў и на жыдоў, сеяли меж ими сварку и ненависць. Патрапили дабицца и таго, што „начальства“ ў Мазырским и Пинским вуездзи не пусцила на выбары арэндатароў и пленипотэнтоў и зрабила гэта ў дзень самых выбароў, каб не магли яны скаржыцца на незаконны паступак. Дзеля таго ў гэтых вуездахъ выбрали чорнасоценцоў. Выбаршчыки падали скаргу у Губэрнскую камиссию, але яе и не разбирали. Ў гарадзкие выбаршчыки ад Минскаго вуезду папали кандыдаты „трудавога комитэту“. Было их 6 чалавек, и яны пастанавили на губэрнских выбарах злучыцца разам з мужыками и с паляками, бо тады тольки у их будзе сила и яны не пусцяць ў Думу ни воднаго чорнасоценца. Алеж чорнасоценцы и тут не спали: яны патрапили зрабиць так, што „начальства“ признала выбары ад Минскаго вуезду незаконными, хоць на гета не было ниякой важнай прычыны. Дабиўшыся гэтаго, чорнасоценцы занялися ужо тольки мужыками. Ўсих праваслаўных выбаршчыкоў — мужыкоў, а их было шмат, памесцили у архирэйским доме, и тут праз тры дни чорнасоценцы так задурыли им голавы, што цёмные людзи паслухали намовы ворагоў свабоды народнай и пастанавили выбирац адных чорнасоценных кандыдатоў.

Мужыкоў на архирэйским дварэ добра пилнавали и не дазваляли никому хадзиць да их, каб не патрапили яны згаварыцца з гарадзкими. Да мужыцких выбаршчыкоў дапускали тольки чорнасоценцоў, навэт не выбаршчыкоў. А як зайшли да их два чалавека ад гарадзких, каб зрабиць саюз, то чорнасоценцы их вон прагнали, а палиция на вулицы арыштавала их и павела ў вучастак, гдзе трымали их кольки гадзин.

На выбары зьявилося 130 выбаршчыкоў, памеж каторыми чорнасоценцы мели „сваих“ 65 голасоў. Дзеля таго, што 6 гарадзких не пусцили, саюз гарадзких з мужыками нечорнасоценными и паляками меў тольки 59 голасоў, значыць менш, як чорнасоценцы. Вось и выбрали ўсех чорнасоценных кандыдатоў: двох руских памешчыкоў Лашкарова и Ивашчэнка (з их адзин надта вялики чыноўник, а други—атстаўны палкоўник, оба жывуць у Пецербургу); пяць мужыкоў — чорнасоценцоў (Шымански, Рэмончык, Рудзински, Краскоўски, Гаврыльчэнко) и работника Мельникова.

Як пишуць, ёсць шмат прычын, каб признаць выбары незаконными и скасаваць их. Хутка мусиць выбаршчыки ад Минскай губ. зъедуцца на новые выбары. Дай жэ Бог, каб адкрылися вочы цёмным мужыкам и каб выбрали яны сваих шчырых заступникоў, а не чорнасоценцоў—ворагоў свету и свабоды ўсей працавитай беднаты! **„Минчук“.**

---

**З Гродны.** Ў Гродне архирэй, як и у нас бискуп Рооп, адслужыў перад выбарами абедню и сказаў выбаршчыкам чорнасоценскую проповедзь

---

ехали на рыбу. Як на грэх, лоў быў шчасливы. Пападалися найбольш лины и шчупаки... За высоким сухим чаротом ничога не бачыли рыбаки. Тольки што яны выбрали рыбу з апошней тони, бачаць—ляцяць на их казаки у высоких касматых шапках. У бедных „бунтароў“ и люльки павыпадали з зубоў на лёд; адна навэт укинулася ў палонку.

— Кладзи невад на сани!—крыкнуў адзин казак.

Пакорна споўнили мужыки гэта прыказанне. Худая кабылка цягнула мокры невад и цэбар з рыбаю, а мужыки апусциўшы голавы, шли за возам, падганяемые казацкими нагайками.

Бедных мужыкоў вяли чэрэз сяло. Дзеци галасили на ўсю вулицу; бабы прычытвали, як па нябошчыках. На других санях, на абапол каторых ехали верхами казаки, сядзеў вучыцель. На им было халоднае палито и летняя шапка.

— Вось и рыбы налавили, и на санях, як губэрнатары, пад ахранаю павозимся, — жартаваў вучыцель, каб развесялиць кампанию, а сам таки бледны, и горэ свецилося ў кожнай яго жылцы.

Ўся гэта невясёлая працэсия ўжо выхадзила з вёски. Стары Юрка стаяў кале варот свайго двара.

— За што вы пабрали их?—сказаў Юрка, стаўшы пасерод вулицы: ёсць у вас крыж на грудзях? Верыце вы ў Бога? О, каты вы, разбойники! Упадку няма на вас, праклятых!

Адзин казак хлыснуў старога дзеда нагайкаю па твары.

— Бог вас пабье, кровопиўцы!—застагнаў дзед, прылажыўшы руку да разбитай твары. И кроў старога дзеда чырвоными капельками падала на снег, и слёзы, як раса прэд заходом сонца, апошни раз выступили на яго сухих вочах на сусклони апошних дзён яго жыцця... **Лесавик.**

(казанне). На гэтым казанню ён, с крыжом ў руках, лаяў жыдоў з апошних слоў, гаварыў, што найлепшые прыяцели мужыкоў адны памешчыки и прызываў выбираць их именем Хрыста. Да выбароў мужыкоў никуды не пускали, запёршы ў казённай кватэры. Мужыки, ашалеўшые и перапалоханные архирэем, ўсе прадалися памешчыкам и выбрали ў Думу пяць мужыкоў не на суменню, а па жаданню архирэя и памешчыкоў. Ад паноў прайшли Лопацин и Ячыноўски.

# Ветрыско

Вецер гамониць ды байку адну
З часоў нядаўных вядзе мне сваю.

———

Сильных нас сокалоў вораг скаваў,
Гнаў нас далёка, ў няволю загнаў.
Скрыдлы дык рвалися ў вольны прастор,
Ў дальняе поле, высоки той ўзгор...
Ценжар кайданоў не дасць нам ляцець,
Вестнику воли ярмо дык надзець?!
Стой жэ ж ты цёмных грамадаў пасол!
Сорам няволи ня сцерпиць сакол!
Сокат панёсся ды голас той гром:
Дружне кайданы й ярмо мы сарвём!
Вораг у страси, злы вораг дрыжыць.
У нас замирэння ўжо стаў ён прасиць.
Стаў ён нам гутарку тую плясьци:
„Киньце битву вы са мною вясьци,
Песьни страшные так смела сьпеваць,
Буру на царства мае накликаць!
Шлецеж ваякаў сваих да мяне—
Ўбачу, што ёсць ў сакалоў старане?“
Добра! Мы просьбину прымем тваю.
Дык жэ ж паслухай: у нашым краю
Сокалы болей няволю цярпець
Думы ня маюць: табе ж—не ўладзець...
Борздо ланцуги жадаюць скидаць.
Бич твой ня будзе над нами свистаць!

———

Вецер гамониць ды байку адну
Циха вядзе пра маю старану.

*Марко Хмурны.*

# З усих старон.

Ў **Пэрсии**, як и ў Расеи, да апошняго году запраўляў гасударствам шах (цар) с сваими сваяками дый чыноўниками. Народ абеднеў и, ня могучы болей церпець ад правицельства абдзиранства, ў прошлым гаду ўзбунтаваўся. Шах спалохаўся и сагласиўся даць народу мэджылис (Думу), але не даў гётаму мэджылису, як и у нас Думе, жадных праў. Мэджылис патрэбоваў ад шаха, каб ён два годы не разганяў народных дэпутатоў; народ падтрымаў мэджылис, и шах мусиў уступиць. Недаўна мэджылис зноў патрэбоваў, каб министры залежэли ад народных прэдставицелёў, каб народам запраўляли не чыноўники, а сам народ праз сваих выбарных, каб судзи не залежэли ад администрации и каб змесцили нелюбимаго народам начальника Науса з усими яго памочниками. Шах спрацивиўся. Тагды народ ўзбунтаваўся зноў проциў правицельства, и шах даў свой соглас на ўсё, чаго трэбаваў мэджылис.

———

**З Лодзи.** Мы ўжо ўспаминали, што ў Лодзи гаспадары закрыли свае фабрыки и заводы, и сотни тысячоў работникоў застаюцца без куска хлеба. Нядаўна кольки знатных польских людзей с прэдставицелями ад работникоў паехали ў Бэрлин да тых гаспадароў, каб яны зноў адкрыли свае фабрыки и заводы. Гаспадары адказалися. Яны чэкаюць, пакуль работники зусим не замучацца и ня згодзяцца на тое, чаго хочуць гаспадары.—Газэта «Przełom» на гэтае пишэць, што, каб Польшча мела аўтономiю (свае правицельства), то такое правицельства памагло бы работником. Можна было бы ўсе фабрыки и заводы адняць ад гаспадароў и абъявиць их гасударствеными, тагды и гасударства мела бы карысьць, и работники зарабляли бы болей.—**Д. Б.**

———

**Вильня.** Ешчэ ў прошлай восени вучэники Виленской Праваслаўной Семинарыи збунтавалися проци свайго Инспэктора. За гэта шмат их вон пагнали и паразсылали их па хатах. „Начальства“ ня ведало, хто найбольш бунтаваўся; вось с таго часу аж да гэтае пары заседала асобная комисия, каб даведацца, як усё зрабилася и хто найбольш винаваты. Дзеля гэтаго комисия паразсылала да бацькоў сэминарыстоў друкованые листки, с каторых адзин папаў и ў нашы руки. Ў им комисия

пишэ, каб бацьки стараліся дапытацца у дзецей сваих аб тым, хто падбиваў да бунту, хто и з якого класу выпусциў проклямацию, хто гвалтаваў за вячэрай и гасиў лямпы; з якого класу и яки вучэник кинуў куб ад вады, хто паламаў шафу, хто першы кинуў казелок у дзьверы инспэктора и якие вучни далей кидали казелки; хто вьюшкай на шнурку выбиў 4 шклы у кватэры инспэктара и т. д. Ешчэ пишэ ў гэтым листку: „чы, бунтаваў сын ваш и як ён бунтаваў? Можэ сын ваш ешчэ што колечы паведаў вам пра гэты бунт? Напишэце усё гэта.“—У канцы комиссия абецуе бацьком, каторые здрадзяць сыноў сваих и прышлюць, што ад их выцягнули, — никому аб гэтым не казаць: гэта, бач, патрэбна тольки для яе.

Праз гэтакую жандармско-езуицкую штуку выгнали ешчэ 21 вучэникоў, каторые прыехали пасля каляд ў Сэминарыю.—Вось якие ў Сэминарыи пастыри и вучыцели, што абучаюць маладых людзей на папоў, каторые павинны сеяць памеж людзьми зерня праўды и дабра. А навуку ихнюю пачынаюць с подлых даносоў, и гэта называецца „наводзяць на справедливую дарогу!“

Дзякуем за такую навуку! **Сэминарыста.**

---

**З Лидзкаго пав.** У вёсцы Фальковичы (Ганчарской вол.) Кавалак надзельной зямли неяк забрала казна. Прайшло шмат гадоў. На той зямли вырас лес. Мы, мужыки, агледзилися, што земля гэта—наша, и хацели адабраць яе. Дзеля таго папрасили мы вуезднаго каморника (землемера) Кандыбу и казённаго каморника—памочника рэвизора, каб яны назначыли нашые границы, як мае быць. Яны гэта зрабили, и паказалася, што наша праўда. Пасля прыехаў да нас самы рэвизор, каб выдзелиць и аддаць, што нашэ. Перш написаў ён некую паперу и прыказаў нам падписацца, што згодзилися на яго границы, а пасля ўжо выдзелиў нам зямлю, алеж ня ўсю, бо тольки тую часць, гдзе были кусты, а гдзе быў добры лес — той не даў нам.

Як назнали мы, што нас ашукали, то пачали сеч той лес—для зачэпки. Прыехаў абъезчык клеймиць зрубленые пни, алеж яго прагнали. Тагды прыехаў пристаў и кале 16 стражникоў—са стрэльбами, як на вайну. Пачали дапытывацца, хто рубиў лес, цы страшыць: пропадзецё цы заплацицё тысячоў за 2...—Алеж як паглядзеў пристаў плян ды границы, то сказаў, што праўда наша; усёж таки написаў пратакол, хто скольки зрубиў, и даў нам падписаць.

Призваў нас да сябе спраўник, и там як пачаў крычаць за нас наш Янка Ашурак, то и апраўдаў. Усёж таки пристаў рапў нам ехаць да Вильни и пакуль што лесу ня сеч. Як прыехали да Вильни, то пайшли да адваката и з им пайшли да Упраўлення Государственными Имуществами. Адвакату сказаў памочник начальника Управлення, што кепска мы зрабили, што секли лес и падписалися у рэвизора, але парадзиў исьци на миравую. Як пайшли мы да яго други раз—ўжо без адвоката, дык зачаў ён на нас крычаць, чаму той лес сякли. Мы уцякли ад яго, пайшли да губэрнатора и падали яму прашэнне: абецаўся нам памагчы, тольки ня ведаем, чы з таго будзе якая пацеха. Пакуль што хоць зямля и наша, а карыстаць є ёй ня можна.

**П.**

---

**Хаценчыцы,** вилейскаго пав. 27 января у нас быў сход. На гэтым сходзе гаварыли аб расходах на гэтый год. Усим многа збавили пэнсии. Старшыне дали 60 руб. перш браў 120 р.; писару 200 р.; перш браў 372 р.; прэдседацелю суда 20 р., заместа 120 р., судзям па 10 р. заместа 60 р.; старастам па 12 р. а брали па 40 р. Гэтым прыгаворам астаўся моцна недавольны писар. Ен перш гаварыў, што гэта напрасна ваша гутарка; высшае начальства николи не пазволиць, каб писару давали малую пэнсию. На гэта яму сказали—„кали высшае начальства багата, то нехай яно табе дасць многа, а у нас дзеци дохнуць без хлеба“; пасля гэтага ён стаў маргаць вачами и цискаць нагами тых, хто ближэй стаяў да яго, але як и гэтые штуки ничога ня памагли, то ён кинуў прыгавор и пайшоў у свае пакои. Прышоўшы назад павёў гутарку аб хвэльчары; дали пэнсии с памоцникам 473 руб. Першый прыгавор (смета) таки астаўся ня кончэны и не падписаны никим па воли писара. **Я. Гаравик.**

---

**Рэдакция и Кантора «НАШАЕ НИВЫ» пераехала на Завальную вулицу № 45. Просим туды адрэсаваць усіо.**

---

Рэдактор-Выдаўца А. Ўласоў.

Друкарня М. Кухты, Дворцовая, д. № 4.